Наталля Валанцэвіч
дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў
УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»,
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

# Тэма выхавання маладога пакалення вачыма беларускіх драматургаў XIX стагоддзя

У першай палове XIX ст. айчынныя аўтары ў драматургічных творах закраналі разнастайную ідэйную праблематыку. У «Ідыліі» і «Апантаным» В. Дуніна-Марцінкевіча, «Жыцці Сіраты» Я. Баршчэўскага, «Каспары Карлінскім» У. Сыракомлі і «Адвячорку» Г. Марцінкевіча ёсць шэраг цікавых разважанняў пра моладзь, у прыватнасці, пра тэму выхавання і адукацыі тагачаснага маладога пакалення.

Яшчэ ў пачатку 1840-х гг. В. Дунін-Марцінкевіч адзін з першых выказаў заклапочанасць маральнымі арыенцірамі і духоўнымі каштоўнасцямі моладзі. Так, у «Ідыліі» закаханая Юлія імкнецца апраўдаць паводзіны Караля, які пасля ад'езду за мяжу стаў пагарджаць простым людам, беларускай мовай і народнай культурай, яго ўзростам і нявопытнасцю: «Ён такім маладым, маласвядомым пакінуў нас <…> а папаўшы ў таварыства сапсутай моладзі, мог сказіць звычаі і забыць збаванныя рады майго добрага айца» [2, *15*]. Сам жа шляхціц-франкаман у далейшым шкадуе пра гады навучання:

> У моднай вучаны школе,
> Я жыў, як і жыць не варта [2, *52*].

У адрозненні ад Караля маладая шляхцянка вельмі добра разумее, навошта патрэбна «тое выхаванне, што ў пансіёне атрымала»: «Хіба ж не на тое мы вучымся, каб лепш хваліць Бога ды вярней выконваць тыя абавязкі, якія наш стан на нас накладае?» [2, *23*]. Юлія з іроніяй гаворыць пра тагачасную еўрапейскую адукацыю многіх паненак, «каторыя ад маладых лет да сталага веку ўвесь час вучацца салёным манерам» [2, *23*].

Я. Баршчэўскі ў «Жыцці Сіраты» (1845—1849) у роспачы разважаў пра маладых панічоў, якія «гадуюцца як няшчасныя калекі», бо ўсё за іх робяць іншыя, а яны «ні пра што не думаюць і растуць бяспечныя, як дрэвы». Гэтыя думкі драматург прамаўляў вуснамі сялянскага філосафа Бонкі, які ў заключэнні сваёй прамовы сцвярджаў, што «потым ад



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бяздзейнасці і ляноты, ад нязвыкласці да перашкодаў <…> пачынаюць быць ганарыстымі, пагарджаць людзьмі, нарэшце ад недалужнасці розуму і Бога забываюцца, а потым і нашчадкі калекі душой і целам» [1, *358*]. У адрозненні ад узгаданых шляхціцаў, якія часцей за ўсё выхоўваліся замежнымі настаўнікамі, за Сіратой даглядала мясцовая жанчына, якая добра распавядала розныя народныя гісторыі. Можна меркаваць, што нянька не разыходзілася з маці дзяўчыны ў падыходах да выхавання, бо менавіта Ганне было даручана ўзгадаваць малую Геленку. Мацярынскае настаўленне мае абагулена-філасофскі характар, таму і гучыць у спеве Духа маці:

Бога, край свой, веру, брата,
Сыне мой, любі без краю.
Свет цярпі, жыццё — не свята,
Бо яно, як сон, знікае [1, *352*].

В. Дунін-Марцінкевіч і ў сярэдзіне 1850-х гг. сцвярджаў, што асновай выхавання павінна быць «узбагачэнне хрысціянскіх цнотаў». У «Апантаным» (1855) некалькі разоў творца акцэнтаваў увагу на ідэальных выхаваўчых прынцыпах мінулых часоў, у прыватнасці, XVI ст., калі не толькі простыя людзі, але і кашталянка, і дачка гетмана вельмі шанавалі свае традыцыі і культуру ў адрозненні ад жанчын XIX ст., якія:



Сваёй вучонасцю сучаснай ганарацца,
Бо Сю, Бальзака і Дзюма пералісталі
І думкамі за Мантэхрыстамі лятали.
З традыцый кпяць і з мовы роднае спрадвечнай
І бачаць варварства ў іх прастаце сардэчнай [4, *207*].

Драматург сцвярджаў, што менавіта са зменамі ў прынцыпах адукацыі звязаны і новы погляд на жыццё маладых людзей, больш скіраваных на матэрыяльна-прагматычнае, чым на духоўнае.

Можна адзначыць, што на аналагічныя працэсы ў сферы тагачаснай літаратуры звяртаў увагу і У. Сыракомля, які ва ўступным слове да камедыі «Граф на Ванторах» (1856) адзначаў, што «захопленыя эфектамі французскай літаратуры, нашыя пісьменнікі шкадуюць нават, што нашы звычаі і традыцыі не даюць асновы для стварэння такой багатай кампазіцыі, як “Жыд вечны” альбо “Монта-Крыста”» [5, *127*].

У «Каспары Карлінскім» (1857) маці заклапочана марамі сына пра ваенныя подзвігі на карысць айчыны. Карміцелька Марта, супакойваючы яе, раскрывае традыцыйныя прынцыпы дзіцячага выхавання ў мясцовых сем’ях:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глядзяць на зброю, слухаюць пра войны,
Гойсаюць на конях праз палі і рвы.
Чытаннем хронік дух разаграваюць,
У Жыццяпісу Святых ахвярнасць бачаць.
Нічога гэта не шкодзіць, няхай прызвычайваецца рана.
А ці ён немец, бавіўся бы ў лялькі? [5, *199—200*].

У «Адвячорку» (1858) Г. Марцінкевіча адзін з галоўных персанажаў Васіль сцвярджае, што сяляне «не хамуты». Прамаўляючы некалькі разоў гэтае грубае слова, што азначае «некультурны», «неадукаваны», мужык-гаспадар намякае на народную мудрасць. Так сталася, што адукацыя была прывілеем заможных саслоўяў, таму драматург тройчы даводзіць думку аб навуцы і ведах, якія з'яўляюцца і марай для простага чалавека, і выйсцем з цяжкага становішча:

Дзяцей грамаце прывучаць —
Спазнаюць Бога, людзей,
Вельмі спосабаў палучаць,
Як жыць у жызні сваей [2, *87*].

Такім чынам, айчынных драматургаў вельмі хвалявала пытанне асветы і выхавання маладога пакалення. Часцей за ўсё творцы адстойвалі прынцыпы, што склаліся шмат стагоддзяў таму і былі правераны часам: любоў да роднага краю, павага да традыцый і хрысціянскія дабрачыннасці.



*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Баршчэўскі, Я.* Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі ; уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. — 480 с.
2. Беларуская літаратура XIX стагоддзя. — Мінск : Маст. літ., 1995. — 368 с.
3. *Дунін-Марцінкевіч, В.* Выбраныя творы / В. Дунін-Марцінкевіч ; уклад., камент. Я. Янушкевіч. — Мінск : Маст. літ., 2001. — 239 с.
4. *Дунін-Марцінкевіч, В.* Збор твораў : у 2 т. — Т. 1 : Драматычныя творы, вершаваныя аповесці і апавяданні / В. Дунін-Марцінкевіч ; уклад. з тэкст. падрыхт., прадм., перакл. і камент. Я. Янушкевіч. — Мінск : Маст. літ., 2007. — 494 с.
5. Pisma epiczne i dramatyczne Władysława Syrokomli. — T. 4. — Poznań : M. Jagielski, 1868. — 274 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ